УДК 81’42

# ТАКТЫКІ ДЭВІЯНТНАЙ КАМУНІКАЦЫІ Ў СІНХРОННЫМ ІНТЭРНЭТ-ДЫСКУРСЕ

**Доўгаль Алеся Валер’еўна**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)

*У артыкуле разгледжаны такія тактыкі дэвіянтнай камунікацыі ў сінхронным інтэрнэт-дыскурсе, як тролінг, флеймінг і эльфінг. Адзначаецца, што гэтыя тактыкі адносяцца да неэкалагічных форм маўленчага ўзаемадзеяння, паколькі характарызуюцца таксічнай эмацыйнасцю і ўстаноўкай камунікантаў на канфліктныя зносіны.*

**Ключавыя словы:** дэвіянтная камунікацыя, інтэрнэт-дыскурс, таксічная эмацыйнасць, маўленчае ўзаемадзеянне.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*The article discusses such tactics of deviant communication in synchronous Internet discourse as trolling, flaming and elfing. It is noted that these tactics relate to non-ecological forms of speech interaction, since they are characterized by toxic emotionality and the attitude of communicants towards conflict communication.*

**Keywords:** deviant communication, Internet discourse, toxic emotionality, speech interaction.

Інтэрнэт-камунікацыя разглядаецца як форма маўленчага ўзаемадзеяння людзей, якая характарызуецца спецыфічным каналам сувязі і сродкамі камунікацыі. Зносіны ў сацыяльных сетках з᾽яўляюцца часткай публічнай прасторы кожнага чалавека, у якой адбываецца сацыяльна і індывідуальна значымы дыскурс. Максімальна набліжанымі да спантаннага маўлення з᾽яўляюцца чаты, форумы і блогі з каментарыямі як формы сінхроннага інтэрнэт-дыскурсу, дзе пісьмовая інтэракцыя карыстальнікаў адбываецца ў рэжыме рэальнага часу. Такое ўзаемадзеянне рэпрэзентуе поліадрасатную мадэль камунікацыі, паколькі суб᾽ект маўлення можа адначасова мець некалькіх суразмоўцаў, пры гэтым назіраецца пастаянная змена камунікатыўных ролей "адрасат – адрасант".

Адной з істотных прымет інтэрнэт-тэксту (ад аднаслоўнай рэплікі ці смайліка да разгорнутага поста) з᾽яўляецца зваротнасць, г. зн. адрасаванасць выказвання пэўнаму (рэальнаму ці патэнцыяльнаму) адрасату. Ажыццяўляючы камунікацыю праз інтэрнэт, мы не можам не ўяўляць асобу адрасата, таму гэты факт абумоўлівае мэту (інтэнцыю) выказвання і выбар сродкаў яе дасягнення (вербальных, невербальных). Як камунікацыя ў цэлым, інтэрнэт-зносіны характарызуюцца рознымі тыпамі ўзаемадзеяння адрасанта і адрасата, або стратэгіямі. Пад камунікатыўнай стратэгіяй разумеецца "комплекс маўленчых дзеянняў, скіраваных на дасягненне камунікатыўнай мэты" [3, с. 182]. У сінхронным інтэрнэт-дыскурсе лінгвісты вылучаюць наступныя стратэгіі камунікатыўнага ўзаемадзеяння [4, с. 15–21]:

1) людычная (заснавана на задавальненні лінгвакрэатыўных патрэб віртуальнай камунікатыўнай асобы праз выкарыстанне разнастайных прыёмаў маўленчай гульні);

2) эндэмічная (скіравана на змену паводзінаў адрасата па прычыне іх неадпаведнасці існуючым у інтэрнэт-суполцы правілам або рэалізацыю лідарскіх амбіцый адрасанта);

3) ацэначная (мэта – знізіць камунікатыўны статус адрасата або падкрэсліць яго значымасць, а таксама пацешыць уласнае самалюбства);



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) дэвіянтная (маўленчыя паводзіны, якія парушаюць нормы эфектыўнай камунікацыі);

5) фасцынацыйная (ажыццяўляецца ўплыў на эмацыйную сферу адрасата з мэтай павышэння даверу да інфармацыі, "адключэнне" здольнасці яе крытычнага ўспрымання).

У артыкуле разгледзім тактыкі дэвіянтнай (дэструктыўнай) камунікатыўнай стратэгіі ў інтэрперсанальным сінхронным інтэрнэт-дыскурсе. Калі камунікатыўная стратэгія з`яўляецца лініяй (тыпам) паводзінаў, якая грунтуецца на матывах, то тактыка разумеецца як спосаб дасягнення камунікатыўнай мэты ў межах той ці іншай стратэгіі. "Любая маўленчая стратэгія як творчае ажыццяўленне плана зносінаў дапускае розныя спосабы яго рэалізацыі – набор маўленчых тактык" [4, с. 14].

Дэвіянтная стратэгія мае канфрантацыйны характар, перлакуцыйным эфектам якой з`яўляецца маўленчы канфлікт. Да канфліктагенных фактараў ў інтэрнэт-дыскурсе адносяцца апасродкаванасць камунікацыі, ананімнасць камунікантаў, фізічная адсутнасць у працэсе зносінаў, што стварае ілюзію бяспекі, імгненнае распаўсюджванне інфармацыі, нівеліраванне сацыяльных адрозненняў і раўнастатуснасць суразмоўнікаў, раўнапраўны доступ удзельнікаў да камунікатыўнай прасторы.

Тролінг як адна з тактык дэвіянтнай стратэгіі камунікатыўных зносінаў у інтэрнэце разглядаецца даследчыкамі як маўленчая правакацыя з мэтай эскалацыі камунікатыўнага канфлікту. Тролінг уяўляе сабой асобнае правакацыйнае, часам ілжывае, зневажальнае выказванне з мэтай стварэння канфліктнай сітуацыі, дыскрэдытацыі прадмета маўлення, прыніжэння асобы або сацыяльнай групы па пэўнай прымеце. Тролінг заснаваны на негатыўнай ацэнцы, якая выражаецца эксплліцытна або імпліцытна. Прыклады з каментарыяў сацыяльнай сеткі Instagram (захоўваецца аўтарская арфаграфія і пунктуацыя):

*Блин, что у неё с речью... Многие люди вставляют белорусские словечки.. У неё это звучит ужасно, речь отвратная!*

*Что за тренд появился: жрать на камеру? Неприятное зрелище*

*Поколение зумеров судя по инстаграму кроме тупых слов ничего не принесло в этот мир!*

Сутнасць інтэрнэт-тролінгу, яго стратэгічная задача – "ініцыяваць або актывізаваць камунікатыўны працэс" [1, с. 113]. Адрасант адкрыта імкнецца парушыць танальнасць зносінаў, прынізіць апанента, справакаваць на грубасць, таму "камунікатыўнай няўдачай тролінгу будзе адсутнасць рэакцыі на гэтыя агрэсіўныя дзеянні" [1, с. 113].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вынікам эфектыўнай маўленчай правакацыі (тролінгу) з`яўляецца флеймінг – агрэсіўная форма маўленчых паводзінаў, заснаваная на ўзаемным абмене негатыўнымі эмацыйна-ацэначнымі выказваннямі. Камуніканты не імкнуцца дасягнуць хоць якой прагматычнай мэты, адбываецца "спрэчка дзеля спрэчкі", "вербальная сварка", яны наўмысна зневажаюць адзін аднаго. Такая форма ўзаемадзеяння абіраецца свядома, паколькі кожны сам вырашае, удзельнічаць ці не ўдзельнічаць у падобнай палеміцы і калі яму выйсці з гэтай таксічнай сітуацыі. Флеймінг не мае лагічнага завяршэння, у адрозненне ад рэальнага канфлікту: камунікаты проста спыняюць агрэсіўны дыялог у пэўны момант. Прыклад флеймінгу ў сацыяльнай сетцы Instagram, трыгерам для якога стала выказванне аднаго з карыстальнікаў з негатыўнай ацэнкай асаблівасцей вымаўлення блогера *"У вас что нос заложен?"*. Гэты каментар справакаваў агрэсіўную палеміку (сам блогер у ёй не ўдзельнічаў):

*– а у вас нет фото в профиле... смотрите за собой!*

*– а может у вас заложен мозг?*

*– а, у вас морда лица заложена в ломбард*

*– это прям важно для вас. Не ваш же нос заложен. Бестактность зашкаливает!!!*

Кожная рэпліка ў флеймінгу становіцца стымулам для далейшай канфрантацыі, "флеймінг-дыялог выглядае як узаемнае практыкаванне ў зласлоўі" [1, с. 115].

Тролінг і флеймінг з`яўляюцца прыкладамі дэструктыўных канфліктагенных узаемаадносінаў інтэрнэт-карыстальнікаў. Аднак калі тролінг уяўляе сабой маўленчае дзеянне (асобнае выказванне), то флеймінг з`яўляецца вынікам тролінгу і рэалізуецца як маўленчае ўзаемадзеянне (дыялог).

Антыподам інтэрнэт-тролінгу як формы агрэсіўных паводзінаў з`яўляецца тактыка эльфінгу – пахвала і кампліменты на адрас аўтара грубых правакацыйных выказванняў. Гэта ажыццяўляецца праз прыёмы наўмыснай, часам іранічнай згоды з ім, адабрэння і падтрымкі яго пазіцыі, празмернай пеяратыўнай ацэнкі яго паводзінаў і пад. Прыклады эльфінгу:

*– Женщина, что с вами??? Мужик мужиком!*

*– я оставила место прекрасной вам. У вас потрясающая внешность и красивое лицо*

Аднак такая форма маўленчых паводзінаў толькі на першы погляд нагадвае імкненне да бесканфліктных, канформных узаемаадносінаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Празмерная ветлівасць інтэрнэт-эльфаў ёсць не што іншае, як сплانаваны маўленчы акт з мэтай дэстабілізацыі эмацыйнага стану апанента, паколькі гіпертрафіраваны кампліментарны стыль зносінаў пачынае раздражняць адрасата. У выніку агрэсіўны дыялог спыняецца.

І тролінг, і эльфінг з`яўляюцца формамі таксічных маніпуляцыйных узаемаадносінаў, рознымі бакамі правакацыйных маўленчых паводзінаў. Розніца паміж імі заключаецца ў вербальных сродках уздзеяння: грубых і зневажальных у троля і пахвальных і ліслівых у эльфа. Калі троль адкрыта ігнаруе маральныя прынцыпы камунікацыі, то эльф стараецца быць максімальна ветлівым у зносінах.

Такім чынам, тролінг, флеймінг і эльфінг з`яўлюцца тактыкамі дэвіянтнай камунікацыі ў сінхронным інтэрнэт-дыскурсе, агульнай прыметай якіх выступае таксічная эмацыйнасць і ўстаноўка камунікантаў на канфліктныя зносіны. Тролінг з`яўляецца прычынай праяўлення флеймінгу і эльфінгу як розных форм маўленчай рэакцыі на агрэсіўную вербальную правакацыю. Тролінг і флеймінг яднае агрэсіўны характар камунікацыі. Тролінг і эльфінг, нягледзячы на процілегласць вербальнага інструментарыю, ілюструюць форму маніпуляцыйных маўленчых паводзінаў. Па форме рэалізацыі тролінг, флеймінг і эльфінг розняцца тым, што першая тактыка ўяўляе сабой асобнае выказванне, самастойнае маўленчае дзеянне, дзве другія – гэта дыялагічнае ўзаемадзеянне. У сінхронным інтэрнэт-дыскурсе гэтыя тры тактыкі суадносяцца як прычына (тролінг) і вынік (флеймінг, эльфінг). Разгледжаныя тактыкі мэтазгодна адносіць да неэкалагічных форм маўленчага ўзаемадзеяння карыстальнікаў сеткі інтэрнэт [2, с. 49], паколькі яны не адпавядаюць нормам і стандартам эфектыўнай камунікацыі.

## Літаратура


1. Воронцова, Т. А. Тролліннг и флеймнг: речевая агрессия в интернет-коммуникации / Т. А. Воронцова // Вестник Удмуртского университета. Серия «История и филология» – 2016. – Т. 26, вып. 2. – С. 109–116.
2. Доўгаль, А. В. Неэкалагічныя тэндэнцыі ў інтэрнэт-камунікацыі / А. В. Доўгаль // Вестник МГЛУ. Сер. 1, Филология. – 2024. – № 3 (130). – С. 47–55.
3. Иссерс, О. С. Коммуникативные стратегии и их реализации в речи / О. С. Иссерс // Речевое воздействие: учеб. пособие для студентов / О. С. Иссерс. – Москва : Флинта : Наука, 2009. – С. 177–193.
4. Рыжков, М. С. Речевые стратегии участников синхронного интернет-дискурса (на материале русско- и англоязычных чатов) : автореф. дис. ... канд. фил. наук : 10.02.19 / М. С. Рыжков ; Елецкий гос. университет им. И. А. Бунина. – Воронеж, 2010. – 25 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова